# «Самае каштоўнае ў жыцці даецца бясплатна»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

І яшчэ з узростам разумееш: сям'я — гэта некалькі пакаленняў. Чым яна большая, тым мацнейшы падмурак у цябе пад нагамі. Асабіста я заўсёды адчуваў за спінай сваіх продкаў. У свой час вельмі хацеў, каб бабуля, ветэран вайны — Раіса Міхайлаўна Марозава, — убачыла нашага з Вікай першынца. Якая шчаслівая яна была, калі мы з жонкай прывезлі паказаць ёй Міцю! А потым і Саша, і Юра пазнаёміліся са сваёй прабабуляй. Памятаю, як здзівіўся Юра, калі яна надзела свае ордэны: «Тата, а прабабуля Рая — герой?» — спытаў ён у мяне.

Сёння ў мяне самога ёсць унучка Мацільда, якой два з паловай года. І калі гэты анёлак прыходзіць у госці, я разумею, як цудоўна, што яна з ранніх гадоў засвойвае: ёсць мама і тата, дзядулі і бабулі, а яшчэ прабабулі і прадзядулі.



## ГАЛОЎНЫ ПРЫНЦЫП — НЕ НАШКОДЗЬ!

— Я заўсёды ставіўся да розных сістэм выхавання з пэўнай доляй іроніі. Колькі прыкладаў, калі ў выдатных бацькоў выраслі нягоднікі, а ў бесталковых мам і тат, у нездаровым, здавалася б, асяроддзі — дастойныя людзі. Чаму так адбываецца? Не ведаю. Нараджэнне чалавека, станаўленне яго асобы, яго лёс — гэта, памойму, самая вялікая з існуючых загадак. І ўсё ж, безумоўна, я веру ў сілу бацькоўскага прыкладу. Дзеці штодня назіраюць, як бацька і маці ставяцца адно да аднаго, да навакольных, да працы і, як правіла, капіруюць іх паводзіны.

Важна, каб муж і жонка былі аднадушныя ў пытаннях выхавання. Калі адзін дазваляе нешта, а іншы забараняе — гэта вядзе да маніпуляцый з боку дзіцяці.

**Часта чуеш, што сямейныя саюзы творчых людзей нетрывалыя. Не згодны. Мне здаецца, прафесійная прыналежнасць у гэтым не адыгрывае ніякай ролі.**



З унучкай Мацільдай.

Вялікіх праблем у нас з сынамі і дачкой не ўзнікала. Я пазбягаў катэгарычных забарон: яны, як правіла, выклікаюць актыўнае супрацьдзеянне. Ніколі дзяцей не караў, стараўся размаўляць, тлумачыць. Мы з Вікай не навязвалі ім сваіх жаданняў, не перашкаджалі шукаць сябе, проста накіроўвалі, падтрымлівалі і дапамагалі. Напрыклад, дачка Саша ў свой час не магла вызначыцца, літаратуры ці маляванню аддаць перавагу. Звярталіся да спецыялістаў, якія яе прафесійна тэсціравалі, каб дапамагчы зрабіць правільны выбар. У выніку Саша паступіла ў Акадэмію мастацтваў, дзе вучылася ў народнага мастака Беларусі Барыса Герлавана. Сёння яна — мастак-сцэнограф, вельмі захопленая сваёй працай. Старэйшы, Дзмітрый, яшчэ ў школьныя гады хацеў зрабіць камп'ютарную дзіцячую супер-гульню, таму і стаў праграмістам.

Малодшы сын Юра марыў пра футбол. Шмат трэніраваўся. Але, магчыма, перагарэў. І вырашыў паступаць на рэжысуру. Спачатку я імкнуўся неяк адбіць у яго гэты намер. Але ўбачыў, з якой цікавасцю і ўпартасцю ён паглыбляецца ў класіку, чытае творы Дастаеўскага, Булгакава, Гогаля, Талстога, і зразумеў: не трэба яму перашкаджаць.

**Пасля рэпетыцый і спектакляў, фізічна знаходзячыся дома, у думках я яшчэ нейкі час звычайна ў тэатры. Жонка часам пытаецца: «Ты калі дадому вернешся?»**

Наогул, галоўны прынцып у адносінах бацькоў і дзяцей, на мой погляд, такі ж, як у медыцыне: не нашкодзь!. Навязванне нашчадкам сваёй волі нярэдка заканчваецца драмамі і канфліктамі. Мае бацькі не перашкаджалі мне выбіраць сяброў, прафесію, спадарожніцу жыцця. І я прытрымліваюся такіх жа поглядаў.

## ЗНАЙСЦІ СЯБЕ

— Я скончыў тэатральны інстытут у 1991 годзе. Гэта быў складаны час. Многія з аднакурснікаў палічылі за лепшае заняцца не мастацтвам, а бізнесам. А я вырашыў: нішто не прымусіць мяне адмовіцца ад рэжысуры. І сёння задаволены сваім выбарам. Хаця прафесія складаная: на рэжысёры ляжыць адказнасць за вялікі калектыў. І калі табе не вераць,



Сяргей Міхайлавіч са сваімі бацькамі Міхаілам Станіслававічам і Эміліяй Міхайлаўнай і малодшым сынам Юрыем.

гэта падкошвае. Асабліва ўразлівы, пакуль малады і неспрактыкаваны. За гады працы з'яўляецца панцыр, які ратуе ад знешніх уколаў, але ўсё роўна яны часам адчувальныя. Застаюцца ў рэжысуры толькі тыя, хто не ўяўляе жыцця без тэатра. Ці перашкаджала мне маё прозвішча? Ці баяўся, што будуць параўноўваць з бацькам? Не. Разумею, што крытэрый ацэнак у мастацтве — густ. Аднаму падабаецца спектакль у пастаноўцы Міхаіла Кавальчыка, а іншаму — Сяргея Кавальчыка. Галоўнае — быць цікавым гледачу. І я не бачу нічога страшнага ў тым, калі ў сям'і з'явіцца яшчэ адзін рэжысёр.

## ВЫЛЕЧВАННЕ МАСТАЦТВАМ

— Тэатр існуе не адно тысячагоддзе. Калі б ён не быў патрэбны, даўно б знік. Спектаклі (і не толькі трагедыі, але і камедыі) ішлі нават у блакадным Ленінградзе! І сёння, нягледзячы на кінематограф, тэлебачанне, інтэрнэт, каласальную індустрыю забаў, людзі чамусьці па-ранейшаму наведваюць тэатр. Чаму? Арыстоцель лічыў, што сапраўднае мастацтва выклікае катарсіс, гэта значыць, ачышчэнне, абнаўленне чалавека. Я не веру, што спектакль здольны кардынальна змяніць кагосьці. Нават геніяльныя пастаноўкі наўрад ці могуць злосных зрабіць добрымі, велікадушнымі. Але разважлівых людзей мастацтва падахвочвае думаць, эмацыянальных — суперажываць, адгукацца на пачуцці герояў. Тэатр — гэта размова з гледачом. Няхай на некалькі гадзін, але чалавек пераключаецца са штодзённасці, асабістых праблем і клопатаў на гісторыі выдуманых персанажаў, хвалюецца за іх, плача і смяецца. Мастацтва пашырае кругагляд, дае надзею на найлепшае выйсце. Сам я таксама стараюся захоўваць у сабе веру ў лепшае, зараджаць аптымізмам і энергіяй навакольных.

**Калі сужэнцы шануюць адносіны, то пры жаданні заўсёды можна знайсці выйсце, утаймаваць эгаізм, вырашыць супярэчнасці, захаваць стасункі.**

## АДОЛЕЦЬ ЗЛО І НЕ СТАЦЬ ЛІХАДЗЕЕМ

— Як рэжысёр заўсёды выбіраю той драматургічны матэрыял, які знаходзіць водгук ува мне самім, дазваляе падзяліцца з гледачом сваімі разважаннямі. Напрыклад, рок-оперу «Граф Монтэ-Крыста» захацелася паставіць, таму што гэты персанаж Аляксандра Дзюма для мяне — сапраўдны герой. Ён цікавы запалам, сваёй унутранай барацьбой. З-за людской зайздрасці, злосці, здрады Эдмон Дантэс страціў усё: нявесту, сям'ю, свабоду. Цудам вырваўшыся з палону праз 17 гадоў, ён прагне адплаты. Але мяжа паміж перамогай справядлівасці і помстай вельмі тонкая. Добрыя намеры, як вядома, часам прыводзяць у пекла. Гэта ж вечнае пытанне: як пакараць зло і самому не стаць ліхадзеем. Часта ў казках герой адсякае тры галавы ў Змея Гарыныча, а замест іх з'яўляецца 6, а потым 9 новых. Дык ці трэба ўступаць са злом у адкрытае супрацьборства альбо яго трэба ігнараваць? Галоўнае, па-мойму, — больш актыўна рабіць дабро, звужаючы такім чынам прастору для разгулу цёмных сіл. А цану сабе, сваёй душы кожны даведаецца толькі па выніках, калі стане зразумела: добрага ці злога ён стварыў больш.

Увогуле, шчыра перакананы: усё, што можна купіць за грошы, — марнае, імгненнае, лёгка заменнае. А самае каштоўнае для чалавека — каханне, сяброўства, здароўе, талент і само жыццё — даецца бясплатна. І шанаваць трэба менавіта гэта.

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ.**